# СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС І НАЙНОЎШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА



**Літаратурны працэс — складанае, гістарычна абумоўленае развіццё літаратуры як комплексу ўзаемазвязаных фактаў і з’яў.**

Літаратурны працэс



# Культуралагічныя складнікі літаратурнага працэсу пач. XXIст.

- Літаратурныя арганізацыі ў пач.XXIст.
- Выдавецтвы. Часопісы - пач.XXI ст.
- Літаратурныя прэміі пач.XXст.
- Літаратурныя падзеі.
- Літаратурацэнтрычныя праекты.

# Літаратурны працэс пач.XXIст.

## МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА

- Дзяржаватворная літаратура;
- Літаратура эстэтызму;
- Літаратура катастрафізму;
- Літаратура эксперыменталізму;
- Беларуская літаратура на іншых мовах;
- Сеціратура.

## ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА

1. Прафесійная крытыка;
2. Карыстальніцкая крытыка.

Літаратура беларускага замежжа

Вернутая літаратура

# Дзяржаватворная літаратура

Гэта працяг на новым мастацкім узроўні традыцый нацыянальнай літаратуры, яе актыўнай спрычыненасці да пабудовы самастойнай Беларусі. Сучасная дзяржаватворная літаратура адметная выразным асветніцкім і грамадзянскім пафасам. Яе асноўнае ядро – нацыянальная ідэя.

Нашую дзяржаватворную літаратуру складаюць ***гістарычная проза і драматургія, грамадзянская паэзія, мемуарная і дакументальная проза.***

У апошнія дзесяць-пятнаццаць гадоў на першы план актыўна выйшлі аўтары гістарычных раманаў, аповесцяў, п’есаў: ***Я. Конеў, Л. Дайнека, Г. Далідовіч, Л. Рублеўская, У.Гніламёдаў, З.Дудзюк, А. Петрашкевіч, А. Дудараў*** і іншыя.

Дапаўняе названы пералік публікацыі грамадзянскай лірыкі ***(М. Мятліцкі, Г. Пашкоў, М. Башлакоў*** і іншыя).

## Літаратура эстэтызму

У яе аснове ляжыць прызнанне прыгажосці, красы як асноўнай і вечнай каштоўнасці чалавецтва. У цэнтры ўвагі пісьменнікаў – стваральнікаў названага напрамку - любоў да мастацтва, любоў да навакольнай красы, каханне, любоў да творчасці і пад.

Апяванню ідэалаў прыгожага, узнёслага і гарманічнага і надалей прысвячаюць свае творы ***Соф'я Шах, Аксана Спрынчан, Л. Дранько-Майсюк.***

## Літаратура катастрафізму

Акцэнтуе ўвагу на глыбінных прыродных катаклізмах, нацыянальных, псіхалагічных, маральных, светапоглядных, цывілізацыйных зрушэннях. Тут і незагойная чарнобыльская тэма, і нядаўнія аповесці і ***прыпавесці В. Быкава***, і аголена-набалелая ***проза В. Казько***, проза ***М. Купрэева***, і разважліва-пранікнёная проза ***Б. Пятровіча***, і апакаліпсічна-вычувальныя публікацыі ***У. Сцяпана, Ю. Станкевіча.***

## Літаратура эксперыменталізму

Яе вылучае ***адсутнасць апоры на звыклыя формы літаратуры.*** Творы паэзіі, прозы, драматургіі дораць новы, асаблівы род свабоды: не заўсёды эксперыментальная літаратура мае строга адну разгадку і адзін сэнс. Часта ўспрыманне суб'ектыўнае, мера разумення залежыць ад індывідуальнага вопыту чытача.

У беларускай літаратуры прыкладам з’яўляюцца тэксты ***В. Бурлак, В. Жыбуля, Д. Дзмітрыева і іншых.***

У адзіноце
ўзгадваю
назвы нотаў.

**ДО**,
**РЭ**,
**МІ**,
**ФА**,
**СОЛЬ**,
**ЛЯ**,
**СІ**,
**ДО-**

сыць
называць
непатрэбнае,
бо не спяю паводле нотаў
ніводнага імгнення жыцця.
Але з душою спяю пра

**ДО**лю,
і **РЭ**ха,
і **МІ**лаванне,
і **ФА**нтазію,
і **СОЛЬ** зямлі,
і **ЛЯ**сы,
і **СІ**нечу,
і **ДО-**
сыць…

Аксана Спрынчан

**Беларуская літаратура на іншых мовах (*А. Андреев, О. Ждан, Е. Попова, С. Бартохова* і інш).**

- Канферэнцыя «Белорусская русскоязычная литература в контексте современной белоруской культуры» (2003),
- анталогія «Современная русская поэзия Беларуси» (Мінск, 2003), хрэстаматыя «Минская школа» на рубеже XX–XXI вв.» (Мінск, 2007),
- зб. арт. «Русскоязычная литература Беларуси» (2010),
- кніга У. Гніламёдава «На рубеже времён: (русскоязычная поэзия Беларуси)» (2013).

# Літаратура і Інтэрнэт

## Літаратура ў інтэрнэце

**— гэта пераважна “традыцыйная літаратура”, якая пішацца для папяровых выданняў.**

## Сеціўная літаратура

(электронная літаратура, гіпертэкст)

**- гэта творы, якія ўзніклі ў Інтэрнэце, дзякуючы яго спецыфічным і характэрным магчымасцям, менавіта таму іх праблематычна перамясціць на традыцыйны носьбіт.**

СЕЦІРАТУРА — *гэта сучасная разнавіднасць мастацкага сінкрэтызму, ускладненага магчымасцямі найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.*

**Яе функцыянальныя асаблівасці**:

- дынамічнасць,
- працэсуальнасць,
- хуткая распаўсюджвальнасць,
- інтэрактыўнасць,
- віртуальнасць бытавання.

**Найбольш яркія узоры уласна сеціратурных з'яў у паэзіі:**

«відэавершы» Валярыны Куставай;

калектыўная электронная паэма «Буслан і Жабміла» (ініцыятыва Юрася Нератка з аўтарамі - Мікола Кандратаў, Агрэніч Аліна, Емельянаў Алесь, Карэліна Ірына, Кучмель Наталка);

«паэтычна-геаграфічны» інтэрнэт-праект «Вершы без межаў» Мікіты Найдзёнава.






**Андрусь Горват першы, хто ў Беларусі рэалізаваў рэаліці-праект у літаратурным фармаце. Кніга, зробленая ў інтэрактыўным рэжыме**

**Андрусь Горват** (нар. 1983) — беларускі пісьменнік і журналіст.





**Людміла Рублеўская** (1965) —
беларуская паэтэса, пісьменніца, літаратурны крытык.






П’еса “Лондан” Максіма Дасько – гэта яркі прыклад так званай сеціратуры.

Тэкст “Лондан” складаецца з фотаздымкаў і мультымедыя файлаў, якія з’яўляюцца паўнавартаснай часткай твора, а замест класічных дыялогаў нам прапануецца аповяд галоўнага героя.

Фармат дадзенага тэксту, нараджаецца на супастаўленні розных відаў мастацтваў, як то фатаграфіі, музыкі і непасрэдна літаратуры.



# Экспертная і карыстальніцкая крытыка

**Экспертная («прафесійная») крытыка аддае перавагу:**

- праблемным артыкулам (палемічнага, аналітычнага, аглядавага кшталту),
- літаратурным партрэтам,
- літаратурна-крытычным эсэ,
- рэцэнзіям.

**Параметры карыстальніцкай крытыкі:**

- аператыўнасць;
- інтэнсіўнасць (колькасная агрэсія);
- суб’ектывізм;
- правакацыйнасць;
- інтэрактыўнасць (шматвектарная зваротная сувязь паміж крытыкамі, пісьменнікамі, чытачамі).

## *Сістэма зменаў у сучаснай беларускай літаратуры:*

| **змястоўна-сэнсавы ўзровень** | **жанрава-стылявы ўзровень** | **ацэначна-рэфлексійны** |
|---|---|---|
| пошукі беларускай літаратуры ў пач. XXI ст. цэнтруюцца вакол феномена беларушчыны | «мініяцюрызацыя» (перавага ў агульнай жанравай структуры мастацкай славеснасці малых і мініяцюрных форм, прычым не толькі ў прозе ды паэзіі, але і ў крытыцы), экспансія новага — электроннага — фармату чытання | да літаратурнай крытыкі, чытацкіх водгукаў, публікацый у неспецыялізаваных СМІ ў XXI ст. далучаецца літаратурная журналістыка як адметная з'ява |

## Напрамкі і стылі літаратуры пач.XXI стагоддзя

**Постпостмадэрнізм -** новая плынь некласічнай эстэтыкі канца XX – пач. XXI стстс. у класіфікацыйным плане блізкая постмадэрнізму. Постпостмадэрнізм, у адрозненне ад мадэрнізма і постмадэрнізма, прапануе некаторыя новыя эстэтычныя і мастацкія каноны. Яго эстэтычная спецыфіка складаецца ў стварэнні прынцыпова новага мастацкага асяроддзя “тэхнавобразаў”.

**Пострэалізм -** У аснове пострэалізма ляжыць універсальны прынцып адноснасці, дыялагічнага зразумення свету, які бесперапынна змяняецца. і адкрытасці аўтарскай пазіцыі ў адносінах да яго. Рэальнасць успрымаецца як аб’ектыўная дадзенасць, сукупнасць мноства акалічнасцяў, якія ўплываюць на чалавечы лёс. У першых творах пострэалізма адзначаўся дэманстратыўны адыход ад сацыяльнага пафасу, пісьменнікі звярталіся да прыватнага жыцця чалавека, да яго філасофскага асэнсавання свету.

**Неанатуралізм -** паказ жыцця, а як аголенай ў сваёй абсурднасці і жорсткасці штодзённасці: гэта соцыўм у "мініяцюры".

**Неасентыменталізм.** Вяртанне пачуццёвых матываў, зварот да пачуццёвай сферы чалавека. Усведамленне каштоўнасці простых пачуццяў "маленькага", негераічнага чалавека.

# Асаблівасці існавання навейшай беларускай літаратуры задаюцца двума восевымі параметрамі:

| | |
|---|---|
| — у пачатку XXI стагоддзя беларуская літаратура захоўвае тыпалагічныя адзнакі літаратуры **класічнага тыпу**; | — новая інфармацыйная рэальнасць ўзмацнілі тэндэнцыі да **спалучэння рэалізма і мадэрнізма** ў адным тэксце. |

## Прысутнасць беларускай літаратуры ў рэчышчы сусветнай:

1. Ваенная проза пра падзеі Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.
2. Чарнобыльская тэма.
3. Псіхалагізаваная проза.
4. Інтэлектуальная паэзія. Алесь Разанаў у гэтым атрадзе далёка не адзінокі.
5. Беларускі літаратурны авангардызм.
6. Беларускае фэнтэзі. Гэта і Раіса Баравікова, і Людміла Рублеўская, і Алена Масла і шэраг іншых аўтараў.
7. Беларуская інтымная лірыка.

.

Да ліку галоўных задач
сучаснай беларускай літаратуры належаць:

1) выяўленне заканамернасцей развіцця беларускай літаратуры ў розныя гістарычныя эпохі;
2) раскрыццё паэтыкі літаратурных родаў, відаў і жанраў;
3) вызначэнне творчай індывідуальнасці найбольш значных майстроў мастацкага слова.




Зборнік «Дараванне» прысвечана сучаснай аповесці. У выданне ўвайшлі творы Алены Брава, Алега Ждана, Анатоля Бензерука, Алеся Бадака, Андрэя Федарэнкі. Аповесці розныя па тэматыцы, але іх аб’ядноўвае пафас, у аснове якога ляжыць выяўленне агульначалвечых маральных каштоўнасцей.




Зборнік сабраў пад адной вокладкай творы адзінаццаці сучасных аўтараў. Кніга ўяўляе сабой шматгалосую сімфонію беларускіх літаратараў. Іх пошукі адказаў на спрадвечныя пытанні гучаць то пяшчотна-замілавана, то жорстка-просталінейна, то магічна-іншасказальна.




Новая кніга з серыі "Сучасная беларуская літаратура" сабрала прозу пісьменнікаў некалькіх пакаленняў. Невялікія творы прысвечаны невычэрпнай тэме ўзаемаадносін паміж людзьмі і духоўных пошукаў чалавека. Аўтары паказваюць, як па-рознаму можа праяўляцца любоў і як яна ўплывае на лёс людзей. Апавяданні ў прафесійным агучванні можна праслухаць з дапамогай QR-кодаў.




Гэта зборнік жаночых навел. У ім адлюстраваны пяшчотны і пільны, здзіўлены і гнеўны погляд беларускіх пісьменніц на наш час. У невялікіх творах столькі падзей і эмоцый, што ўвесь зборнік успрымаецца як фестываль сучаснага кароткаметражнага кіно.




Пятая кніга – «Інструкцыя па спакушэнні замужніх жанчын» – зборнік сучаснага мужчынскага апавядання. Правакацыйную назву выданню даў невялікі аповед-інтэрв'ю з інтрыгуючым пачаткам і нечаканым фіналам. У кнізе ёсць творы, якія з першай старонкі захапляюць дынамічным і непрадказальным сюжэтам. А ёсць апавяданні-прытчы, апавяданні-споведзі, у цэнтры – спляценне эмоцый.




Новая кніга з серыі "Сучасная беларуская літаратура" сабрала творы, натхнёныя беларускімі міфамі і легендамі. Героі Алеся Кажадуба, Людмілы Рублеўскай і Ганны Навасельцавай існуюць на мяжы рэчаіснасці і неверагоднасці. Кожны з прыведзеных твораў – мастацкі пошук адказаў на спрадвечныя пытанні чалавека.




Новая кніга з серыі «Сучасная беларуская літаратура» змяшчае творы ў жанры анімалістыкі. Невялікія апавяданні сучасных пісьменнікаў-прыродазнаўцаў дазваляць чытачу зазірнуць у самыя розныя куты роднай прыроды, падгледзець жыццё звяроў і птушак. Кніга нагадвае, што людзі адказныя за захаванне прыгажосці нашай планеты для будучых пакаленняў.




Новая кніга з серыі "Сучасная беларуская літаратура" сабрала апавяданні маладых пісьменнікаў. Невялікія творы спалучаюць традыцыйны жанр з новымі нечаканымі формамі самавыяўлення – кожны аўтар дэманструе свой унікальны погляд на сучаснасць.

ДЗЯКУЮ ЗА ЎВАГУ!